# Мінулы час



* * *

Бягуць гады.
Так хутка.
І, як раней,
пакутуе
наш народ.

*2003 г.*

KAMUNIKAT.org

## Мінулы час

*На выгнаньні ў чужыне мінулае забірае ў палон. У вачах стаяць шчымлівыя вобразы былога... Няма сілы разьвітацца з пражытым часам. Уяўляеш яго зноў і зноў, быццам спадзяешся, што ў мінулае можна яшчэ вярнуцца там, на Радзіме. Хоць у рэальнасьці ўжо няма таго сьвету, і людзі мінулага ўжо не жывуць. І толькі галасы гучаць, як некалі ў былым... І ўсё гэта круціцца, круціцца, як наканаваньне, як змора, як замкнутае кола. Здаецца, ня выйдзеш зь яго – то й загінеш. І тады я падумаў:*

Памятаючы, трэба йсьці наперад,
Каб вярнуўшыся,
Далей пайсьці.

*2002 г.*

## Сьпеў

Чым далей жыву,
Тым больш мне гучыць
Маладосьці сьпеў.
І міжволі
Сьпяшаюся я.

*2006 г.*

* * *

Верасьнёвы мароз.
І сыпецца лісьце.

## Школа

Драўляная школа
(Дзе вучыліся бацька і маці, і я)
Нашчэнт састарэла –
Развалены дом.
І чую здалёк я,
з ружовай абрыні
Мой голас звонкі
На пакінутым
школьным
двары...

*2001 г.*

## Слухаю музыку Міколы Стомы

Над далёкімі лясамі
Сіні арэол.
Таемны згук і галасы з дарог.
Цягнік па стыках,
Як табун прабег.
Кляпаюць косы.
І рокат трактароў,
І мройва над зямлёй,
І далячынь – шчымлівая струна.
Мінулы час пра Беларусь,
Пра Беларусь гучыць.

*2002 г.*

## Размаўляю з жонкай пра мінулы час

Мы сьпявалі ўсюды, ўвесь час.
Беларусь, Беларусь...
Нам хацелася радасна пець.
І толькі на чужыне
Мы зразумелі сэнс
Сьпяваньня на бяду,
На гора,
На цяжкае жыцьцё...
Недасягальнае былое,
Вярніся нам ізноў
І зьлітуйся,
Умацуй,
Багаславі...

*2001 г.*

* * *

Ідуць гады,
І ўсё мінулае
Становіцца, як сон.

*2004 г.*

* * *

Калі я ноччу глядзеў на Месяц,
Праляцелі над полем шэрыя гусі.

KAMUNIKAT.org